

У пачатку месяца падняліся максімальныя адпускныя цэны на мяса. Свініна і ялавічына ў крамах і на рынках, паводле тлумачэння Мінсельгасхарча, стаць даражэйшай не павінна.

СТАР. 2



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

31 КАНАЛ



Сёння знакавая падзея ў гісторыі беларускага футбола — упершыню нацыянальная зборная нашай краіны на сваім полі згуляе з дзеючымі чэмпіёнамі свету, камандай Іспаніі.

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. ПЯТНІЦА № 198 (27313) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «НАСТУПНАЯ ЗАДАЧА — ПРАРЫЎ БЕЛАРУСІ Ў ЭЛІТНЫ КЛУБ ВЫСОКАРАЗВІТЫХ КРАІН»

**Учора ў Авальнай зале Дома ўрада адбылося заключнае сумеснае пасяджэнне Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ.**

Аляксандр Лукашэнка выступіў перад дэпутатамі з прамовай, у якой даў ацэнку работы прадстаўнічага і заканадаўчага органа краіны за апошнія гады і выказаў пажаданні для парламента наступнага склікання.



Фота БЕЛТА.

«Чатыры гады вашай працы былі няпростым часам для краіны, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да дэпутатаў і сенатараў. — Крызісныя з'явы ў сусветнай эканоміцы дакаціліся і да Беларусі. Нашы знешнія і ўнутраныя нядобразычліўцы пастаянна атакавалі дзяржаву, спрабуючы парушыць галоўнае заваяванне апошняга дзесяцігоддзя — стабільнасць, спакой і мір у грамадстве».

У тым, што «Беларусь з гонарам вытрымала ўсе выпрабаванні, нацыя засталася адзінай, мы пераадолелі крызіс і працягнулі паступальнае развіццё эканомікі», ёсць немалая заслуга і беларускага парламента, лічыць Прэзідэнт.

Усе гэтыя гады парламент заставаўся найважнейшай апорай палітычнай стабільнасці, умацоўваў адзінства ўлады і грамадства, спакойна і мудра ствараў заканадаўчыя ўмовы для рэалізацыі стратэгічнага курсу, які вызначаны Усебеларускім народным сходам і падтрыманы пераважнай большасцю беларускага народа, сказаў кіраўнік дзяржавы.

Парламентам дзейнага склікання разгледжана больш за 430 законаў, у тым ліку 3 кодэксы.

«Вядома, справа не ў колькасці нарматыўных актаў, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Важна тое, што прынятае вамі заканадаўства дазваляе развіваць эканоміку, паляпшаць жыццё нашых людзей, абараняць іх правы і інтарэсы».

Прэзідэнт падкрэсліў таксама, што высокая выніковасць заканатворчай дзейнасці ў многім тлумачыцца тым, што цяперашні склад Нацыянальнага сходу характарызуецца наяўнасцю ў ім высакакласных спецыялістаў, якія маюць вялікі вопыт прафесійнай і кіраўніцкай дзейнасці.

Яшчэ адной адрознай асаблівасцю дзейнага складу парламента лідар краіны назваў аператыўнасць працы над дакументамі. Нормай стала прыняцце закона на працягу аднаго года, законы аб рэспубліканскім бюджэце прымаліся да пачатку фінансавага года.

«Лічу, што менавіта зладжанасць і аператыўнасць працы парламентарыяў у многім дазволілі вырашаць найважнейшыя задачы забеспячэння дастаткова высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця, сацыяльнага міру і стабільнасці ў грамадстве на фоне крызісных з'яў у сусветнай эканоміцы», — сказаў Прэзідэнт.

Сярод найбольш важных дасягненняў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання ён назваў удасканаленне Падатковага кодэкса, праваахоўнай і судовай сістэм, прыняцце Кодэкса аб адукацыі і новага Жыллёвага кодэкса, шэрагу важных законаў у сферы аховы здароўя, сацыяльнай абароны грамадзян, Закона аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб, фарміраванне дагаворна-прававой базы Мытнага саюза і плённую міжнародную парламенцкую дзейнасць.

Выключна важнай Аляксандр Лукашэнка лічыць таксама працу дэпутатаў у акругах, прыём грамадзян, сустрэчы ў працоўных калектывах, абарону інтарэсаў канкрэтных выбаршчыкаў.

«Па сутнасці, гэта і ёсць галоўная справа для любога парламентарыя, — сказаў беларускі лідар. — Менавіта ў дэпутата просты чалавек павінен знаходзіць абарону ад самаўпраўства. І менавіта клопат і праблемы простых выбаршчыкаў павінны быць компасам для дэпутата ў яго заканатворчай дзейнасці».

Аляксандр Лукашэнка спыніўся на некалькіх момантах, разважаючы пра крытыку ролі беларускага парламента ў кіраванні дзяржавай. Ён нагадаў, што аб'ём паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу вызначаны Канстытуцыяй нашай краіны, якая была прынята на ўсенародным рэферэндуме. «Беларускі народ зрабіў прынцыповы выбар на карысць моцнай улады, моцнай прэзідэнцкай рэспублікі», — нагадаў ён і прыкладамі з сусветнай гісторыі праілюстраваў, наколькі важным з'яўляецца такі выбар для станаўлення маладых нацый і дзяржаў.

«Цяперашняя мадэль беларускай дзяржаўнасці далёка не вычарпала свае магчымасці. Дзякуючы ёй мы стварылі першую незалежную беларускую дзяржаву. На парадку дня наступная гістарычная задача — мадэрнізацыя краіны, прарыў у элітны клуб высокаразвітых краін, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Сёння гэта каму-небудзь можа здацца фантазіяй, але некалі думка пра тое, што Беларусь можа існаваць як суверэнная дзяржава, праводзіць уласную незалежную палітыку, таксама здавалася нязбытнай».

«Тым не менш мы дабіліся гэтага. Даб'ёмся і ўсяго астатняга. І моцная дзяржава з моцнай прэзідэнцкай уладай — гэта неабходны інструмент у дасягненні працвітання і дабрабыту нашага народа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт не пагадзіўся і з абвінавачваннямі ў «безгалосасці» ў бок дэпутатаў. Ён сказаў, што ведае, наколькі вострымі бываюць дыскусіі ў парламенцкіх камісіях і сесіях, але разам з тым заклікаў будучы парламент быць больш адкрытым для грамадства.

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.



Актыўна дапамагаюць ва ўборцы цыбулі гаспадарцы «Фірма «Кадзіна» Магілёўскага раёна навучэнцы мясцовых школ. Цыбуля вырошчваецца тут на 50 гектарах пры сярэдняй ураджайнасці больш за 250 цэнтнераў з гектара.

## АД ЦЫБУЛІ... СМЯЮЦЦА!

### «Прамая лінія»

ВЫДЗЯЛЕННЕ ЗЯМЕЛЬНЫХ УЧАСТКАЎ ПАД ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА, ПЫТАННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ І РЭГІСТРАЦЫІ МАЁМАСЦІ

**Сёння з 12.00 да 13.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгія Іванавіча КУЗНЯЦОВА.** Кіраўнік камітэта адкажа на актуальныя пытанні зямельных адносін, аховы і выкарыстання зямельных рэсурсаў.

**Нумары «прамой лініі»:**

**8 (017) 292 38 92;**
**8 (017) 292 38 21.**

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 10° |
| Віцебск | + 9° |
| Гомель | + 8° |
| Гродна | + 10° |
| Магілёў | + 9° |
| Мінск | + 9° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.10.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8550,00 ▼ |
| Еўра | 11000,00 ▼ |
| Рас. руб. | 274,50 ▼ |
| Укр. грыўня | 1051,30 ▼ |

■ Сустрэча без абцасаў

## «ПАСТАЯННА АДЧУВАЮ СЯБЕ ЦЯЖАРНАЙ»

**ПРА дзяцей дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Наталля Станіславаўна ПАСПЕЛАВА можа гаварыць, здаецца, бясконца. І нядзіўна, бо, як сама прызналася, цяжарнай адчувае сябе ўвесь час.**

### ПРА ПАМЫЛКІ, ЦЫГАРЭТЫ І ЭМАЦЫЙНЫЯ ПАРЫВЫ

**Ужо 23 гады** я працую на ніве аховы дзяцінства. Калі б вы ведалі, колькі я памылак зрабіла, пакуль не зразумела, у чым рэч. Я сапраўды верыла, што калі забраць дзіця з неспрыяльнай сям'і і аддаць яго ў добрыя рукі — значыць зрабіць карысную справу. У мяне ёсць за што прасіць у людзей прабачэння. Хоць ужо дарослыя дзеці, якія былі ўладкаваны ў сем'і маімі рукамі, мне ў асноўным удзячны. Але я сабой не зусім задаволена.

**Магчыма, буду** выглядаць як цётачка, якая актыўна пілуе сук, на якім сядзіць. Але з кожным годам умацоўваюся ў думцы, што дзіцяці ўсынаўленне не патрэбна, яму патрэбна родная сям'я. Усынаўленне магчыма толькі тады, калі сапраўды бязвыхаднае становішча.

**Ніколі не забуду** той дзень, калі спужалася за жыццё ва ўсім свеце. Маленькі хлопчык задраў маечку — а там на жывоціку... сляды ад цыгарэт, якія тушылі п'яная мама з сужыцелем. Першае жаданне, калі я гэта ўбачыла, было схапіць яго, схаваць, нікому не аддаваць.

**У маладосці** мяне вельмі часта наведвала думка, каб самой усынавіць дзіця. Але, павінна прызнацца, усё ж такі ў выглядзе эмацыйных парываў. Разумею, што мая задача па жыцці — быць інструментам для вырашэння чужых праблем. Гэта ў мяне атрымліваецца. Ну колькі я ўсынавіла б дзяцей? Ну аднаго, ну ад сілы дваіх. Траіх? Наўрад ці — мы з сынам жывём у аднапакаёвай кватэры. Мне б органы апекі не далі дазволу. Цяпер я пра гэта не думаю, бо ўжо проста не паспею выхаваць дзіця — узрост.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Сярод супрацоўнікаў цэнтра** ёсць тыя, якія з поспехам сумяшчаюць і працу, і біялагічнае бацькоўства, і ўсынавіцельнае. Я любуюся такімі людзьмі.

**Усынаўленне** — гэта крышку іншы шлях бацькоўства. Вынасіць дзіця можна рознымі органамі: можна жыватом, а можна сэрцам, галавой. Я, пэўна, тая цётачка, якая пастаянна цяжарная і выношвае дзяцей, але толькі ў галаве *(смяецца)*. Усынаўленне — гэта духоўная практыка і вельмі няпростая справа. Няпростая таму, што гэта справа даўжынёю ў жыццё, а таксама таму, што ў аснове ўсынаўлення ляжыць прыняцце чужога чалавека (дзіцяці) як свайго роднага. Усынаўленне без любові не бывае.

### ПРА ВЫПАДКОВЫХ ДЗЯЦЕЙ, ВАЛАСЫ І ПАДАЗРОНАСЦЬ

**Многія думаюць,** што самае галоўнае для ўсынаўлення — прайсці медагляд, мець жыллё, стабільную працу. Але гэта не так. Усынаўленне — гэта штодзённая праца над сабой. І калі ты лянівы душой, то нічога не атрымаецца. На жаль, і лянівыя людзі, здараецца, усынаўляюць. А пасля пакутуюць: «Чаму дзіця так і не палюбіла мяне? Я ж яму ні ў чым не адмаўляю, кармлю, апранаю». І тут адказ адзін: «Вы проста не напружылі сваю душу, каб знайсці шлях да сэрца дзіцяці».

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НОБЕЛЕЎСКУЮ ПРЭМІЮ ПА ЛІТАРАТУРЫ АТРЫМАЎ КІТАЙСКІ ПІСЬМЕННІК МО ЯНЬ

Нобелеўская прэмія 2012 года па літаратуры прысуджана кітайскаму пісьменніку Мо Яню за яго творы, у якіх «галюцынагенны рэалізм спалучаецца з народнымі казкамі, гісторыяй і сучаснасцю». Мо Янь — гэта псеўданім 57-гадовага кітайскага празаіка, які ў перакладзе азначае «маўчы». Яго сапраўднае імя — Гуань Маё. Творы пісьменніка перакладзены на дзясяткі моў. Неафіцыйна Мо Яня называюць кітайскім аналагам Франца Кафкі і Джозэфа Хеллера. Сусветную вядомасць празаіку прынеслі дзве яго навелы, якія ляглі ў аснову фільма «Чырвоны гаалян». У пачатку 2000-х гадоў кітайскія рэжысёры экранізавалі яшчэ шэраг работ Мо Яня.



### ВА УКРАІНЕ РАССАКРЭЦІЛІ ІНФАРМАЦЫЮ АБ БАЯВЫХ ДЭЛЬФІНАХ

Ва Украіне адноўлена праграма падрыхтоўкі марскіх жывёл у інтарэсах ваенна-марскіх сіл краіны. Пра гэта паведамілі ў сілавых структурах Севастопаля. У прыватнасці, гаворка ідзе пра баявых дэльфінаў. «Цяпер у дзяржаўным акіянарыуме ў Севастопалі рыхтуюць 10 афалін для выканання спецзадач ваеннага флоту Украіны, рэгулярна ў акваторыі Севастопаля ўкраінскія ваенныя праводзяць трэніроўкі жывёл па пошуку прадметаў на дне мора», — распавяла крыніца.

Паводле яе слоў, жывёл трэніруюць, у прыватнасці, на абследаванне ўчасткаў мора, пошук пэўных прадметаў, а таксама напад на падводных дыверсантаў. Прадстаўнік сілавых структур распавёў, што ў 2012 годзе былі праведзены паспяховыя трэніроўкі па пошуку прадметаў пад вадой. Плануюцца таксама вучэнні па супрацьдзеянні атацы дыверсантаў у мэтах абароны караблёў у бухце і на рэйдзе. Акіянарыум для спецыяльнай падрыхтоўкі дэльфінаў, а таксама іншых жывёлін быў створаны ў Севастопалі ў 1960-я гады.

### ЭКСТРАКТ ЭХІНАЦЭІ ЎСЁ Ж ТАКІ АБАРАНЯЕ АД ПРАСТУДЫ

Аб эфектыўнасці эхінацэі навукоўцы спрачаюцца даўно. Хтосьці лічыць, што расліна прадухіляе развіццё рэспіраторных захворванняў. Але некаторыя абвінавачваюць яе ў бескарыснасці. Група спецыялістаў з Кардыфскага ўніверсітэта вырашыла паставіць кропку ў гэтым пытанні, правёўшы маштабнае даследаванне, перадае The Daily Mail. Як аказалася, эхінацэя ўсё ж працуе, калі штодня на працягу чатырох месяцаў прымаць па тры дозы. Гэта дазваляла паменшыць частату ўзнікнення прастудных захворванняў у групе з 750 чалавек. Эхінацэя дапамагала нават тым, у каго быў аслаблены імунітэт. Раслінны экстракт не выклікае пабочных эфектаў. Ён зарэкамендаваў сябе як цалкам бясшкодны сродак, нягледзячы на паведамленні аб магчымай алергіі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ТУРЦЫЯ АДПУСЦІЛА СІРЫЙСКІ САМАЛЁТ



**Сірыйскі пасажырскі самалёт, які знішчальнікі ВПС Турцыі 10 кастрычніка вымусілі здзейсніць пасадку ў аэрапорце Анкары, быў адпушчаны і вылецеў да месца прызначэння — у Дамаск, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Сірыйскі Airbus A-320, які ляцеў у Дамаск з Масквы, быў прымусова пасаджаны ў аэрапорце Анкары ў сераду ўвечары. Для яго перахопу ў неба былі паднятыя знішчальнікі F-16 ВПС Турцыі. На борце самалёта знаходзілася 35 пасажыраў, у тым ліку 17 расіян.

Перахоп самалёта адбыўся па ўказанні турэцкіх уладаў, якія атрымалі ад спецслужбаў інфармацыю аб наяўнасці на борце боепрыпасаў. Дазвол на вылет самалёт атрымаў толькі пасля пяцігадзіннага агляду. З лайнера канфіскавалі больш за дзясятак кантэйнераў з камунікацыйным абсталяваннем. Як паведамляецца, гэтае абсталяванне нібыта можа выкарыстоўвацца для вайсковай радыёсувязі або служыць кампанентамі ракет.

Турэцкі бок не даваў у расійскае пасольства звестак аб канфіскацыі з борта A320 якіх-небудзь грузаў.

## ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ЦІ ТРЭБА ЎЗМАЦНЯЦЬ АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯЦЕЙ ЗА СВАІХ ПАЖЫЛЫХ БАЦЬКОЎ?



**Жанна РАМАНОВІЧ, старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:**

— Безумоўна, трэба. Мы якраз з калегамі цяпер і абмяркоўваем гэту тэму. Засмучае, што дзеці не хочуць сёння даглядаць сваіх бацькоў. Гэта дакладна прасочваецца, калі прыходзяць на прыём і просяць прыняць старых у інтэрнат. Маўляў, «я не магу справіцца са сваёй мамай». Калі пачынаеш чытаць матэрыялы справы, разумееш, што 3 месяцы ці год таму кватэра перапісана ўнуку — і адразу бацькі не патрэбны. Трэба спыняць гэта сацыяльнае ўтрыманства, прымусіць дзяцей несці адказнасць за сваіх бацькоў. Думаю, варта на заканадаўчым узроўні памяняць умовы змяшчэння пажылога чалавека, які мае дзяцей працаздольнага ўзросту, у інтэрнат, у прыватнасці, павысіць узрост, аплату. Акрамя таго, трэба ўмацоўваць сямейныя каштоўнасці. Унукі бачаць, як бацькі ставяцца да бабулі і дзядулі. І недарэмна кажуць: як гукнеш, так і адгукнецца.



**Эдуард ВАЙЦЯХОВІЧ, кансультант Цэнтра падтрымкі сельскага прадпрымальніцтва «Камарова», Мядзельскі раён:**

— Трэба гэта рабіць. Але не надта адміністрацыйна, неяк гнутка, асцярожна. У першую чаргу, культуру людзей трэба павышаць, бо пытанне клопату аб пажылых бацьках наўпрост звязана з пытаннем выхавання. Маці маёй жонкі, калі адной жыць стала цяжка, пераехала да нас. Не магу сабе ўявіць, што магло быць па-іншаму... Яна не хацела ехаць, перажывала, што будзе нам перашкаджаць. Але трэба стварыць умовы, каб чалавеку было камфортна, каб ён упісаўся ў ваша жыццё. Яна не адчувае сябе чужой у нашай хаце. Італьянцы прыязджалі, дык мы не хавалі яе, а знаёмілі: «Гэта наша мама». Мэр Сардзініі ёй руку цалуе. Трэба, каб па-людску было. І бюджэт у нас сумесны. А ў некаторых жа хатах дзеляць: «Гэта твая каструля, гэта мая». Альбо (гэта наогул ні ў якія вароты не лезе) старшыня сельсавета фарбуе плот бабульцы, а дзіця ў Мінску сядзіць. Ёсць у нас такія, што самі не могуць часта прыязджаць, дык мясцовым плацяць, каб прыглядвалі за бацькамі, нешта дапамагалі. А не трасуць сельсавет, чаму бацьку хлеба не купіў.



**Барыс МАКОЎСКІ, пенсіянер, які пражывае адзінока, Жлобін:**

— Цяжкае пытанне. Думаю, што пажылыя людзі самі пра сябе павінны клапаціцца. Але для гэтага трэба стварыць такія ўмовы, каб кожны чалавек штомесяц, пачынаючы з першага дня працоўнай дзейнасці, адкладаў частку грошай у банк на кніжку. А дзяржава, у сваю чаргу, забяспечвала нейкія працэнты. І тады не будзе дармаедства і п'янства. Чалавек, пакуль здаровы, павінен назапашваць грошы, каб сваімі рукамі забяспечыць сабе нармальную старасць. А пакуль нас, пенсіянераў, гадуеце вы — людзі, з заробкаў якіх штомесяц ідуць істотныя адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны. А што зменіцца, калі на заканадаўчым узроўні ўзмацніць адказнасць дзяцей за пажылых бацькоў? *(Задумваецца.)* Можа, нараджальнасць павысіцца. Хто ведае?

**Надзея ДРЫЛА.**

# «НАСТУПНАЯ ЗАДАЧА — ПРАРЫЎ БЕЛАРУСІ Ў ЭЛІТНЫ КЛУБ ВЫСОКАРАЗВІТЫХ КРАІН»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы спыніўся на сістэме парламенцкіх выбараў. Беларусь ніколі не адмаўляла змешаную або партыйную сістэму, аднак пакуль час для іх не саспеў, выбары па іх не могуць быць эфектыўнымі, раз у грамадстве няма аўтарытэтных партый, лічыць Прэзідэнт.

Не толькі простыя людзі, але і прадстаўнікі эліты ў нас мала што ведаюць пра існуючыя партыі, заўважыў кіраўнік дзяржавы. Многія не назавуць і трох з акрэсленай платформай і дакладнай праграмай. Ён канстатаваў, што кампанія па так званым байкоце парламенцкіх выбараў ганебна правалілася, паказаўшы слабасць і баязлівасць так званай пятай калоны, якая не жадае нават імітаваць барацьбу за ўладу. «Падстаў для зларадства тут абсалютна ў мяне няма. Шчыра скажу вам: шкада, што ў нас так пакуль і не з'явілася нармальная, сумленная, адказная апазіцыя, якая перажывае за краіну, а не за распілоўванне замежнай міласціны», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі народ зрабіў свой выбар. «Абсалютная большасць насельніцтва падтрымала тых кандыдатаў, якія выступалі за мір і спакой у краіне, за працяг сацыяльна-эканамічнага курсу, заснаванага на незалежнасці і абароне інтарэсаў простага чалавека», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Я вельмі хацеў бы спадзявацца, і я прыхільнік гэтага, каб ужо цяперашні парламент пятага склікання пачаў нейкую мадэрнізацыю нашай палітычнай сістэмы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што гэта будзе залежаць не толькі ад унутраных умоў, але, перш за ўсё, ад таго, у якой знешнепалітычнай сітуацыі будзе існаваць краіна. «Пры жорсткім націску збоку, калі вырашаецца пытанне, быць ці не быць дзяржаве, мы ўсё роўна будзем па-славянску збірацца ў кучу вакол нейкай асобы для таго, каб абараніцца, каб адстаяць свой кавалак зямлі, каб была будучыня ў нашых дзяцей, каб мы проста маглі існаваць як дзяржава, як нацыя, — сказаў Прэзідэнт. — Сёння, што мяне здзіўляе, з'яўляюцца размовы аб тым, што калі немагчыма іх узяць голымі рукамі, трэба падумаць і аб іншых напрамках уздзеяння на Беларусь і на гэта грамадства».

Сярод іншых пажаданняў, якія датычацца работы парламентарыяў наступнага склікання, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць пераемнасці і выкарыстання набытага папярэднікамі заканадаўчага і палітычнага вопыту. «Работа абедзвюх палат парламента павінна быць максімальна ўзгодненай. Усе існуючыя пытанні трэба абмяркоўваць і вырашаць на пачатковых стадыях работы з законапраектам», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, заканатворчасць павінна ісці ў нагу з часам, а пры рабоце над законапраектамі не павінна быць крайнасцяў, пагоні за тэрмінамі і колькасцю.

Яшчэ адно пажаданне Прэзідэнта парламентарыям наступнага склікання — ісці ў народ, адкрыта размаўляць з людзьмі і абавязкова ўлічваць іх меркаванне.

«І, можа быць, самае важнае: парламентарыям пятага склікання перш за ўсё трэба на ўзроўні заканадаўчых рашэнняў забяспечыць рэалізацыю задач, вызначаных у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на бягучую пяцігодку. Гэта двайная адказнасць, паколькі вынікі парламенцкай работы будуць непасрэдна звязаны з вынікамі рэалізацыі названай праграмы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Новаму складу парламента таксама неабходна завяршыць работу па ратыфікацыі міжнародных дагавораў, заключаных у рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Заканадаўчага вырашэння патрабуюць і праблемы стварэння новых высокатэхналагічных рабочых месцаў, ажыццяўлення даступнага жыллёвага будаўніцтва і інш.

«Перакананы, што работа беларускага парламента будзе падпарадкавана адной святой мэце — абароне інтарэсаў народа нашай краіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка падзякаваў парламентарыям чацвёртага склікання за прафесійную і эфектыўную работу.

«Тым, хто не плануе прадоўжыць работу ў новым складзе Нацыянальнага сходу, магу з упэўненасцю сказаць: кадры, якія прайшлі парламенцкую загартоўку, вельмі патрэбны краіне», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў высокія дзяржаўныя ўзнагароды некаторым дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Першая сесія новага — пятага — склікання Палаты прадстаўнікоў пачне працу 18 кастрычніка. У гэты склад выбрана 109 дэпутатаў, а яшчэ па адной з акруг выбары пройдуць паўторна адначасова з выбарамі ў мясцовыя Саветы.

Першае пасяджэнне Савета Рэспублікі ў новым складзе пройдзе 19 кастрычніка.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Па той бок прылаўка

# МЯСА: ШТО ПАЧЫМ ЗАРАЗ У ГАНДЛІ

**У пачатку месяца ў Беларусі падняліся максімальныя адпускныя цэны на мяса. Свініна і ялавічына, якую людзі набываюць у крамах і на рынках, паводле тлумачэння Мінсельгасхарча, стаць даражэйшай не павінна. Павышэнне датычыцца толькі мяса ў тушах і паўтушах, а на вітрыны, вядома, тавар у такім выглядзе не выкладваюць. Тым не менш пагалоска пра «дарагое мяса» не спяшаецца знікаць з размоў у гарадскім транспарце і ў крамавых чэргах. З гэтай нагоды вырашана было правесці невялікі маніторынг: высвятліць, якія сёння ў сталіцы выбар свініны і ялавічыны і цэны на іх.**



Фота Пятра ФАМІНА.

Традыцыйна купіць кавалак-другі апетытнага свежага мяса гараджане выпраўляюцца альбо на вялікі рынак, альбо ў фірмовую краму ад якога-небудзь мясакамбіната ці сельгаспрадпрыемства. Апошні варыянт, калі не хочацца спецыяльна нікуды ехаць — набыць мяса ва ўніверсаме ля дома.

... На мясных радах Камароўкі доўга думаць, што ж купіць, звычайна не даводзіцца. А калі ўсё ж вагаешся, прадаўцы хуценька «вызначаць» цябе з выбарам.

— Вам на што? На адбіўныя? Вось гэтае аддам за 57 тысяч, — прапануюць мне ўжо парэзаныя кавалкі мяса. Не так дарага, але пры бліжэйшым разглядзе аказваецца, што ў будучых адбіўных неяк зашмат сальных пражылак.

Такіх паўфабрыкатаў у кожнага з прадаўцоў колькі хочаш. І ў коштах на іх можна згубіцца. Лепш паглядзець на які кумпяк ці паляндвіцу.

Каля аднаго латка са свінінай прадавец па-змоўніцку мне паведаміла:

— Калі купіце ў мяне, палічу вам па старых цэнах...

— А якія новыя?

— Паляндвіца цяпер — 85 тысяч за кіло, а кумпяк — 75. А я аддам за 75 і 65 тысяч. Панюхайце вось, мяса добрае, «жывое».

Прадавец Таццяна Кірылаўна, якая паказала мне гэтае самае «жывое» мяса, аказалася кабетай гаманкой. На маё пытанне, ці запасаліся людзі мясам да пад'ёму максімальных адпускных цэнаў, адказала ахвотна:

— Не ведаю, кожны ж купляе для розных мэтаў. На тым тыдні былі і такія пакупнікі, што трыста грамаў прасілі ўзважыць, і такія, што куплялі адразу па пяць кіло.

Ялавічная паляндвіца на Камароўцы каштуе ад 100 тысяч рублёў за кілаграм.

Цікаўлюся, па новых гэта цэнах ці па старых.

— А ў каго яны новыя? У нас кошты пакуль не падымаліся.

...У фірмовай краме аднаго з беларускіх мясакамбінатаў чарга стаіць заўжды. Бабулькі з бліжэйшых дамоў ведаюць, калі прывоз (з 9 да 12 гадзін), і пачынаюць дзяжурыць каля дзвярэй ужо ледзь не а палове дзявятай.

З цяжкасцю праціснуўшыся да вітрыны, я пераканалася, што тут цэны крыху больш бюджэтныя, чым на Камароўцы. Той жа свіны кумпяк — 68 тысяч за кілаграм, паляндвіца — 75 тысяч без аглядаў на «старыя» цэны, а кілаграм ялавічнага кумпяка — 82 тысячы рублёў.

Апошні аб'ект — звычайная крама ля дома. Там мяса было толькі замарожанае. Выбар не багаты. Спрабую прыцаніцца да чагосьці падобнага, пра што пыталася да гэтага на рынку і ў краме — свіныя паўфабрыкаты для адбіўных (нарэзаная паляндвіца). З ялавічыны прадавалі толькі лапатку. У выніку — 94 і 65 тысяч за кілаграм. Безумоўна, мэтазгоднай для любой гаспадыні такая пакупка будзе толькі ў тым выпадку, калі часу збегаць на рынак ці адстаяць у чарзе мясной крамы зусім ужо не знойдзецца.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАЗНАЧЫЎ НОВЫХ НАЧАЛЬНІКАЎ УУС МІНСКАГА, БРЭСЦКАГА І ГРОДЗЕНСКАГА АБЛВЫКАНКАМАЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў новых начальнікаў упраўленняў унутраных спраў Мінскага, Брэсцкага і Гродзенскага аблвыканкамаў. Адпаведныя ўказы кіраўнік дзяржавы падпісаў 11 кастрычніка. Начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама назначаны палкоўнік міліцыі Віктар Сянько. Генерал-маёр міліцыі Іван Саўчыц вызвалены ад пасады начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама і назначаны начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама. Начальнікам упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама назначаны генерал-маёр міліцыі Уладзімір Сычэўскі, які вызвалены ад пасады начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ПАТРЫЯРХ КІРЫЛ НАВЕДАЕ БЕЛАРУСЬ

Візіт Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла ў Беларусь, які адбудзецца 14 кастрычніка, будзе прымеркаваны да 400-годдзя з'яўлення Крупецкага абраза Божай Маці, паведамілі БелТА ў Беларускім Экзархаце. «Візіт адбудзецца па запрашэнні Высокапраасвяшчэннейшага Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі», — растлумачылі ў Экзархаце. Патрыярх Кірыл узначаліць урачыстае богаслужэнне ў Свята-Пакроўскім храме Мінска, які пабудаваны на месцы цудоўнага з'яўлення абраза Божай Маці. Падчас візіту адбудзецца таксама адкрыццё помніка Свяцейшаму Патрыярху Аляксію II, устаноўленага ў храме Усіх Святых у беларускай сталіцы.

## УНАЧЫ — ДА МІНУС 4

**У апошнія дні тыдня тэрыторыя Беларусі яшчэ застанецца пад уплывам халоднага атмасфернага паветра, якое паступае да нас з боку Скандынаўскага паўвострава, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Сёння ўдзень амаль паўсюдна будуць ісці кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ад плюс 6 па паўночным усходзе да 12 цяпла — на паўднёвым захадзе краіны. У суботу ўначы атмасферны ціск павялічыцца і дажджоў ужо не будзе, аднак пахаладае яшчэ мацней. Тэмпература паветра ўначы чакаецца толькі плюс 1—6 градусаў, а на глебе і месцамі ў паветры замаразкі да 1—4 марозу. Удзень атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе ў паўднёва-заходнія рэгіёны Беларусі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература ўдзень будзе плюс 5—12 градусаў.

У нядзелю франтальны раздзел будзе рухацца далей на ўсход, таму дажджы пройдуць ужо амаль паўсюдна. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература ў ноч на нядзелю плюс 2—8. І то добра, што без замаразкаў. Удзень — усяго 6—13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Сусветны дзень барацьбы з артрытам

## Праверка для суставаў

**З 12 па 28 кастрычніка ў цэнтральных раённых і гарадскіх паліклініках усіх раёнаў сталіцы, медыка-санітарных частках заводаў, паліклініцы Акадэміі навук можна будзе праверыць сваё здароўе на прадмет развіцця астэаартрозу.**

Паводле слоў галоўнага рэўматолага Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Наталлі МАРТУСЕВІЧ, рэўматычныя захворванні — гэта вялікая група розных па паходжанні запаленчых і дэгенератыўна-метабалічных хвароб, якія паражаюць злучальную тканку (суставы, храсткі, косці, калясустаўныя тканкі), а таксама сасуды, унутраныя органы, скуру, слізістую. У апошняе дзесяцігоддзе адзначаецца выражаны рост колькасці хвароб косна-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, у тым ліку ў дзяцей і падлеткаў. Курэнне, ужыванне алкаголю, гіпадынамія, лішняя вага, атлусценне ў шэрагу выпадкаў запускаюць развіццё і спрыяюць абвастрэнню рэўматычных хвароб. Запаленчыя рэўматычныя захворванні абгрунтавана разглядаюцца як фактары рызыкі развіцця ранніх атэрасклератычных змяненняў сценкі артэрый, у выніку чаго маюць месца інфаркты міякарда, інсульты, трамбозы іншых буйных сасудаў. «Недаацэнка важнасці праблемы ў суставах і пазваночніку прыводзіць да таго, што пацыенты позна звяртаюцца да спецыялістаў», — адзначае спадарыня Мартусевіч.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ У кулуарах

# ЗАДАННЕ НА ЗАЎТРА

**Перад пачаткам заключнага сумеснага пасяджэння абедзвюх палат парламента чацвёртага склікання журналісты мелі магчымасць распытаць дэпутатаў пра тое, што яны лічаць найбольш удалым у сваёй чатырохгадовай працы, і якія найбольш важныя задачы, на іх думку, трэба будзе вырашыць будучаму парламенту.**

### ДЭПУТАТЫ ДАРМА ХЛЕБ НЕ ЕЛІ,

лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД Віталь БУСЬКО.**

— Мы разгледзелі больш за 430 законапраектаў, 3 магутныя кодэксы, якім няма роўных на постсавецкай прасторы, — сказаў ён. — Напрыклад, Кодэкс аб адукацыі ахапіў жыццё беларускага грамадзяніна ад нараджэння да пенсіі. Вялікая заслуга парламента і ў тым, што сёння жыццядзейнымі з'яўляюцца такія інтэграцыйныя структуры, як Мытны саюз і АЭП. Для стварэння Мытнага саюза было прынята каля 70 дагавораў, пратаколаў і пагадненняў, якія дазволілі аб'ядпаць прастору трох краін і забяспечыць бесперашкоднае праходжанне праз іх тавараў і грузаў.

Адзіная эканамічная прастора — яшчэ больш высокая ступень інтэграцыі, калі забяспечваецца рух капіталу і працоўнай сілы. Дзеля гэтага дэпутаты ратыфікавалі 17 асноўных пагадненняў. Але гэта толькі падмурак, наперадзе — вялізная праца. Сёння асноўная мэта — Еўразійскі эканамічны саюз, які абавязкова будзе суправаджацца парламенцкім складнікам. Ніводнае сур'ёзнае эканамічнае аб'яднанне не можа жыць без парламенцкага суправаджэння, лічыць дэпутат.

«Што тычыцца будучага парламента, то ён пачне сваю працу не на пустым месцы, — падкрэсліў Віталь Бусько. — Асноўная яго задача — уніфікаваць напрацаванае ўнутрыінтэграцыйнае заканадаўства. Акрамя таго, падчас працы парламента чацвёртага склікання мы атрымалі статус назіральніка ў Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН (Асацыяцыі краін Паўднёва-Усходняй Азіі. — **«Звязда».**). Гэта — амаль мільярд насельніцтва, больш за $3 трлн тавараабароту паміж краінамі. Мы атрымалі пастаянную пляцоўку для працы там, вельмі актыўна пачалося супрацоўніцтва з Інданезіяй, М'янмай, В'етнамам, Камбоджай, Лаосам. Гэта — неабмежаваны рынак. Перамовы паказалі, што там патрэбна наша сельгастэхніка, наша сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў, нашы тэхналогіі па вывучэнні зямной паверхні і разведцы карысных выкапняў, наша тэхніка для працы ў кар'ерах... Новы склад парламента павінен стварыць заканадаўчую базу для таго, каб мы паспяхова рухаліся на гэтыя рынкі.

### ФОРМЫ ПРАЦЫ ДЭПУТАТАЎ ВЕЛЬМІ РОЗНЫЯ,

дадала **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Галіна ПАЛЯНСКАЯ.**

— Наша камісія пачала сваю працу з таго, што арганізавала парламенцкія слуханні па развіцці сістэмы жыллёвага крэдытавання, — нагадала яна. — Такім чынам мы заклалі праграму працы на 4 гады. Потым сумесна з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва і замежнымі арганізацыямі мы правялі семінары і канферэнцыі па арэндным жыллі, па даступным і камфортным жыллі, па кіраванні нерухомасцю. Праз нашу камісію прайшоў 41 законапраект, і сярод іх самы асноўны — Жыллёвы кодэкс. Вельмі сур'ёзная праца над ім ішла 2,5 года. Навінкі ў новай рэдакцыі кодэкса сталі вынікам працы не толькі дэпутатаў, але і выбаршчыкаў. Мы змясцілі праект закона ў адкрытым доступе ў інтэрнэце і атрымалі больш за 5 тысяч зваротаў грамадзян, кожны з якіх уважліва разгледзелі. Думаю, што новая канцэпцыя Жыллёвага кодэкса робіць пэўныя крокі наперад ва ўдасканаленні жыллёвых адносін, але самае галоўнае, кодэкс будзе цяпер выконваць выхаваўчую ролю — фарміраваць ва ўласніка разуменне адказнасці за сваё жыллё. Спадзяюся, што ў выніку мы ўбачым прыгожыя пад'езды, дагледжаныя тэрыторыі, і кожны чалавек будзе ведаць: гэта — яго асяроддзе жыцця.

### У СФЕРЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І СЯМ'І

да найбольш важных законапраектаў, над якімі працаваў парламент, **Алена ШАМАЛЬ, дэпутат Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі,** аднесла закон аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях і закон аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, якія ўяўляюць небяспеку для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека.

— На жаль, колькасць хворых на ВІЧ і сухоты штогод павялічваецца, — патлумачыла яна. — Вельмі важнымі таксама былі змены ў закон аб шлюбе і сям'і ў частцы падтрымкі жанчын, якія выхоўваюць дзяцей пасля разводу. Законам цяпер прадугледжана падтрымка маці, якая самастойна выхоўвае дзіця-інваліда, з боку былога мужа. Для сучаснага свету вельмі актуальныя і пытанні псіхалагічнай і псіхіятрычнай дапамогі, якія таксама былі ў сферы ўвагі дэпутатаў. Мы дабіліся бясплатнага забеспячэння дзяцей да трох гадоў лекамі, а інвалідаў — сродкамі рэабілітацыі. Сёння ў нашай камісіі знаходзіцца законапраект аб падтрымцы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. У ім прапануецца новы прынцып, згодна з якім дапамога прызначаецца не бацькам, а дзіцяці. Адпаведна прапануецца адзіная градацыя — па чарговасці з'яўлення дзяцей на свет. Дапамогу мяркуецца прывязаць не да пражытковага мінімуму, а да памеру сярэдняга заробку па краіне. На першае дзіця прапануецца выплачваць 35% ад сярэдняга заробку, на другое і кожнае наступнае — 40%, на дзіця-інваліда — 45%. Прапануецца таксама змяніць тэрміны налічэння дапамогі па цяжарнасці і родах, даць права на аплату бальнічных лісткоў маці ў сувязі з рэабілітацыяй дзяцей.

Згадваючы пра нядаўна прынятыя значныя законы для развіцця экстраннай медыцыны, Алена Шамаль заўважыла, што ўсе грамадзяне Беларусі, згодна з імі, з'яўляюцца патэнцыйнымі донарамі органаў пасля сваёй смерці, калі яны пры жыцці не пакінулі пісьмовую нязгоду з гэтым.

### ЛЮДЗІ ПАВІННЫ АЦАНІЦЬ ПРАЦУ ДЭПУТАТАЎ,

спадзяецца **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ.**

— Па-першае, у заканадаўстве цяпер цалкам забяспечана прававая абарона інвалідаў, — запэўніла дэпутат. — Закон пра сацыяльную абарону інвалідаў адлюстраваў усе аспекты іх жыццядзейнасці, уключаючы рэабілітацыю, стварэнне безбар'ернага асяроддзя, уладкаванне на працу, магчымасці міжасабістых зносін. Іншы вельмі сур'ёзны момант — удалося прыступіць да рэалізацыі дзейных захадаў па развіцці пенсійнай сістэмы. Людзі атрымалі магчымасць мець павышаную пенсію, калі яны адкладваюць яе атрыманне. Галоўнае, што людзі атрымалі права выбару. Дэпутаты паклапаціліся і пра тое, каб людзі ў 75-80 гадоў атрымалі падтрымку не толькі фінансавую, але і ў выглядзе сацыяльнага абслугоўвання. Цяпер ёсць большая магчымасць забяспечыць догляд інвалідам, маленькім дзецям, састарэлым людзям. Важна, што ў сацыяльным абслугоўванні сёння могуць браць удзел не толькі дзяржаўныя арганізацыі, але і недзяржаўныя. Усё гэта павінна ўзняць узровень сацыяльнай абароны насельніцтва на новы ўзровень.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЗАТРЫМАНЫ РАБАЎНІК БАНКА

Учора мы коратка паведамлялі пра дзёрзкі рабаўнічы напад на аддзяленне банка па вуліцы Шпалернай у Мінску, калі невядомы пад пагрозай прымянення нажа завалодаў грашыма на суму каля 30 мільёнаў рублёў. Сілы сталічнай міліцыі былі сканцэнтраваны на пошуку і затрыманні злачынцы. У прыватнасці, былі атрыманы прыкметы падазронага. У выніку, як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, па «гарачых слядах» была ўстаноўлена асоба злачынцы. Ім аказаўся грамадзянін Грузіі 1973 года нараджэння, які меў часовую рэгістрацыю ў сталіцы. Аператыўнікі ўстанавілі яго месцазнаходжанне, затрыманне было справай тэхнікі. Частка скрадзенага канфіскаваная. Зараз падазроны знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У ГОМЕЛІ З'ЯВІЛАСЯ ТАТАВА АЛЕЯ

Гэта адзін з рэалізаваных праектаў рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», паведамілі БелТА ў аддзеле ідэалагічнай працы Гомельскага гарвыканкама. Ідэя належыць студэнтцы Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Яне Калядзе. На рэспубліканскім конкурсе моладзевых праектаў яна прадставіла ўласную праграму прапаганды моцных, здаровых і шчаслівых сем'яў, у якой адмысловая роля адводзіцца бацькоўству. Сярод мерапрыемстваў, прапанаваных студэнткай у падтрымку гэтай ідэі, была і закладка Татавай алеі. Цяпер такая алея з «сямейных» клёнаў з'явілася на тэрыторыі дзіцячага садка № 111. Яе высадзілі бацькі з дзецьмі. Паводле слоў аўтара праекта, актыўны ўдзел бацькаў у выхаванні — гэта не толькі праца і пастаянныя турботы, але таксама радасць і самарэалізацыя. Арганізатарамі акцыі выступілі студэнцкая рада Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны, аддзел адукацыі Гомельскага гарвыканкама, моладзевыя валанцёрскія атрады.

**БелТА.**

## СОН ЗА РУЛЁМ



Фота Магілёўскай ДАІ.

У панядзелак 8 кастрычніка, уначы ў Быхаўскім раёне ўшчэнт разбіўся аўтамабіль «Таёта РАВ-4». А людзі засталіся жывымі. Літаральна на роўным месцы пазадарожнік з'ехаў у кювет і ўдарыўся ў дрэва. Аказалася, што вадзіцель, 46-гадовая жыхарка Харкава, ад стомленасці заснула за рулём. На пярэднім сядзенні спаў і пасажыр.

— Калі паглядзець на тое, што засталося ад «Таёты», то здасца, што ў такой аварыі немагчыма выжыць, але, на шчасце, гэта не так, — расказала інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Таццяна Старасотнікава. — Вадзіцель і пасажыр атрымалі траўмы, але не вельмі значныя. Іх выратавалі рамяні бяспекі. Аднак усім кіроўцам нагадваем: жыццёвыя абставіны розныя, але санлівасць і стомленасць — гэта небяспечна. Лепей спыніцца, адпачыць і застацца цэлымі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ДЗЕСЯЦЬ РЫБІН НА 9 МІЛЬЁНАЎ

На беразе Сожа паблізу адной з вёсак Кармянскага раёна дзяржінспектары затрымалі непрацуючага грамадзяніна, у якога быў знойдзены ўлоў вагой 6 кілаграмаў. Ды не зусім звычайны, а з 10 асобін падуста — віду рыбы, які ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Шкода прыродным рэсурсам ацэнена ў 9 мільёнаў рублёў. Праваахоўныя органы вырашаюць пытанне наконт крымінальнай адказнасці грамадзяніна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### АБЗАЦ

◢ **У Беларусі ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да трох гадоў знаходзяцца 2,4 тыс. бацькаў і 242,5 тыс. маці.**

◢ У Мінску з 13 кастрычніка пачнуць уключаць ацяпленне ў жылых дамах, інтэрнатах, гасцініцах, басейнах, агульнагарадскіх лазнях, будынках навучальных устаноў. Такое рашэнне прынята ўчора ў Мінгарвыканкаме. З 18 кастрычніка дазволена ўключаць ацяпленне ў грамадскіх і адміністрацыйных будынках, будынках устаноў культуры і спорту. А з учарашняга дня пацяплела ў дзіцячых садках, школьных, лячэбна-прафілактычных, медыцынскіх установах, установах сацыяльнага забеспячэння, музеях, дзяржаўных архівах і бібліятэках.

◢ **Сёлета за 9 месяцаў на чыгунцы зарэгістравана 147 няшчасных выпадкаў. 90 чалавек загінулі (у тым ліку адбылося 21 самагубства), 33 атрымалі траўмы рознай ступені.**

### ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ 23-гадовая Ліндсей Хейвард з Маямі ў сваім узросце дарасла да 2 метраў 6 сантыметраў і стала адной з самых моцных жанчын планеты. Яна важыць 107 кг, можа падняць над сваёй галавой чалавека вагой 100 кг і перакінуць дарослага мужчыну ў другі кут пакоя. Лежачы, яна выжымае штангу ў 320 кг, а гэта больш, чым вага дваіх сланянят. Дзяўчына носіць бюстгальтар памеру 38G. Дарэчы, ужо ва ўзросце 9 гадоў яе рост быў 1 м 80 см. Ліндсей вельмі папулярная ў ЗША яе прафесійны барэц і як мадэль.

2012 ГОД КНІГ

# ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК

## КНІГІ ВЯРТАЮЦЬ САБЕ ТАКОЕ СТАЎЛЕННЕ З БОКУ ЧЫТАЧОЎ

**Пра гэта казалі прадстаўнікі самых буйных дзяржаўных выдавецтваў, калі дзяліліся з прадстаўнікамі прэсы думкамі пра стан кнігавыдання і запатрабаванасць кніг.**

Пытанне важнае: Міністэрства інфармацыі штогод са сродкаў рэспубліканскага бюджэту выдзяляе субсідыі на выданне сацыяльназначных праектаў. Сума субсідый складае ад 1 да 1,5 мільёна долараў. Паводле слоў намесніка начальніка кіраўніцтва выдавецкай дзейнасцю і кніжным гандлем Міністэрства інфармацыі Раісы Бабарыкі, на бягучы год прадугледжана выдаткоўванне 12,5 мільярда рублёў на рэалізацыю сацыяльна значных праектаў а таксама кніг у публічныя бібліятэкі і бібліятэкі школ. За 9 месяцаў выпушчана кніг на 9,5 мільярда рублёў.

**14.30** «Крэмль-1812. Выратаваныя скарбы». Дак. фільм.
**15.10** Спявае Дзмітрый Хварастоўскі.
**16.00** «Кантэкст».
**16.40, 0.55** «Шукальнікі». «Колькі каштавала Аляска?».
**17.25 «Дажывём да панядзелка». Маст. фільм.**
**19.05** Вялікі балет.
**21.15** «Алег Яфрэмаў. Калі я сумленны, я павінен...». Вечар-прысвячэнне.
**22.35** «Выдатныя жанчыны XX стагоддзя. Уоліс Сімпсан». Дак. серыял.
**0.50** «Ікар і мудрацы». М/ф для дарослых.
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Хто ёсць хто ў сучасным свеце». 1995 год.
**5.40** «Тэлескоп». 1992 год.
**6.30, 0.30 «Дзень за днём». Серыял.**
**7.30** «Спявае Валерый Лявонцьеў». Фільм-канцэрт.
**8.00** «Шчаслівага палёту». Канцэрт.
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Кінапанарама». 1990 год.
**11.00** «Да і пасля ...». Год 1978.
**12.10** «Пад знакам задыяка. Шалі». 1991 год.
**14.00** «Праграма «А». 1990 год.
**15.00** «Ліка». Спектакль.
**16.25** «Гукавая дарожка». 1993 год.
**17.00** «Панарама «Кінатаўра» або «Пяшчота да равучага звера».
**18.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**19.00** «На эстрадзе Уладзімір Вінакур».
**19.55** «Піт Сігер: мы пераадолеем!». Фільм-канцэрт.
**21.00** Па старонках «Блакітных агеньчыкаў» 1967—1987.
**22.35** «Лірычныя песні Мікаэла Тарывердзіева».
**23.00** «Кроў і долары». Дак. фільм.
**23.55** «Я — жанчына». 1994 год.
**2.00** «Канцэрт н.а. СССР Мусліма Магамаева».
**4.00** «Тэма». 1992 год.

### MTV

**5.00, 2.00** Music.
**6.30** Шпількі Чарт.
**7.30, 8.45** «Губка Боб». М/ф.
**8.20** «Котасабака». М/ф.
**9.35** «Крутыя бабры». М/ф.
**10.00** News блок Weekly.
**10.30 «Палавінкі». Серыял.**
**11.00 «Чэмпіёнкі». Серыял.**
**16.00, 1.00** «Канікулы ў Мексіцы-2».
**22.00 «Пазл кахання». Маст. фільм.**
**23.30** Big Love Чарт.
**0.30** Трэндзі.

### EUROSPORT

**7.45, 1.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**10.30, 14.00, 17.00, 21.00** Снукер. Еўрапейскі тур.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**15.45** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
**19.00, 23.15** Фігурнае катанне. Гран-пры Амерыкі.
**23.00, 2.00** Матаспартыўны часопіс.
**2.15** Вось гэта дзіва!!!

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Меладрама «Тры таполі на Плюшчысе».
**8.30, 14.30** Прыгоды «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы».
**11.50, 17.50** Камедыя «Драма».
**18.30, 0.30** Камедыя «Бедная Маша».
**20.55, 2.55** Дэтэктыў «Вясковы дэтэктыў».
**22.30, 4.30** Камедыя «Начальнік Чукоткі».

### ДОМ КІНО

**3.00** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... ізноў».
**4.50** Камедыя «Любовь-морковь 3».



**6.30, 17.15** Серыял «Які памнажае смутак».
**7.15, 18.00, 2.00** Серыял «Ліст чакання».
**8.10** Кінараман «Мой малодшы брат».
**9.50** Прыгоды «Д'Артаньян і тры мушкецёры».
**14.00** Серыял «Сваты-5».
**19.00** Золата «Масфільма». Камедыя «Мужыкі!».
**20.40** Драма «Дом».
**22.50** Камедыя «Цэнтравы з паднябесся».
**0.20** Камедыя «Выкрутасы».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Прыгоды «Пра Віцю, пра Машу і марскую пяхоту».
**6.10, 10.10, 14.10** М/с «Прыгоды пінгвіняняці Лало». М/ф: «Каралева Зубная Шчотка», «Мурашыны вожык».
**7.00, 11.00** Маст. фільм «Побач з табой».
**8.15, 12.15** Казкі: «Лятучы карабель», «Мыш і вярблюд». М/ф «Дождж».
**15.00** Фільм-казка «Марозка».
**16.20** М/с «Прыгоды пінгвіняняці Лало». М/ф «Прамое пападанне».
**17.00** Казкі Андэрсена. «Дзікія лебедзі».
**18.00** Рускія народныя казкі. «Апошняя нявеста Змея Гарыныча». М/ф: «Як ліса зайца даганяла», «Жыццё і пакуты Івана Сямёнава».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «На рагу ля Патрыяршых-4».
**20.00, 2.00** Серыял «Оперграпа-2».
**21.00, 3.00** Серыял «Абарона Красіна-3».
**22.00, 23.30** Серыял «Жыццё Кліма Самгіна».

### ТБ3

**5.00, 4.15** М/ф.
**6.15** Маст. фільм «Чароўная сіла».
**7.45** Маст. фільм «Радня».
**9.45** Зоркі і містыка.
**10.30** Каханне па зорках.
**11.30** «Паралельны свет».
**12.30** Х-Версіі.
**13.30** Маст. фільм «Золата дурняў»
**15.45** Маст. фільм «Шанхайскі поўдзень».
**18.00** Маст. фільм «Мэверык».
**20.30** Маст. фільм «Расплата».
**22.30** Маст. фільм «Вогненная сцяна».
**0.30** Маст. фільм «Момант, які круціць».
**2.15** Маст. фільм «Цуды ў Рэшатаве».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Серыял «Дзясятае Каралеўства».
**12.10, 20.10, 4.10** Камедыя «Шэры».
**13.50, 21.50, 5.50** Камедыя «32 снежня». 2-я серыя.
**14.50, 22.50, 6.50** Драма «Край».

### ТБ1000

**3.00** Фантастыка «Матрыца: Перазагрузка».
**5.30** Камедыя «Мышынае паляванне».
**7.15** Драма «Дзевяць».
**9.20** М/ф «Планета 51».
**11.00** Драма «У апошні момант».
**12.35** Прыгоды «Ізгой».
**15.05** Баявік «Абрабаванне па-італьянску».
**17.10** Драма «Самы лепшы».
**19.00** Баявік «Пад Адхон».
**21.00** Драма «Кожную нядзелю».
**0.00** Драма «Адступнікі».

### ІЛЮЗІЁН

**1.05** Бераг маскітаў.
**3.00** Ворагі сярод нас.
**4.25** Вялікія прыгоды Осі і Тэда.
**6.05** Шанхайскія рыцары.
**8.00** Хлопчыкі вяртаюцца.
**9.50** Адпраў іх у пекла, Мэлоун.
**11.55** Зе фільм.
**13.45** Бясстрашны.
**15.35** Каханне здараецца.
**17.30** Прыроджаны гоншчык.
**19.30** Жыццё як катастрофа.
**21.05** Самы лепшы.

### DIVA UNIVERSAL

**5.00, 23.20, 0.10, 1.00** «Дамы сям'і Гілмор».
**6.00, 6.50, 7.40** Шпік.
**8.30, 17.40, 20.45** Копы-навабранцы.
**9.20, 16.50, 20.00** Бацькі.
**10.10, 18.30** Пляткарка.
**11.00, 19.15** Жыццё як шоу.
**11.50** Камедыя «Халасцяк».
**13.30** Драма «Нора Робертс: Гарачы поўдзень».
**15.10** Камедыя «Пабочныя эфекты».
**21.35** Драма «Вочы анёла».
**1.50** Драма «Нора Робертс: Дачка вялікага грэшніка».
**3.25** Драма «Рашучы рывок».

### РАМАНТЫКА

**7.00, 17.50, 20.20, 0.30** «Дваяжэнец».
**7.50** «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
**12.00** «Амазонія».
**12.50** «Рабыня Ізаўра».
**17.00** «Смачнае захапленне+».
**18.40, 19.30, 1.25** «Спакуснік».
**21.10, 23.35** «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам»
**22.00** «Сэм і Джэнет».
**2.20** «Парадоксы кахання».

### AXN-SciFi

**0.55, 1.20, 1.45, 8.55, 9.20, 9.50** Серыял «Бліч».
**2.15, 2.55, 3.40, 12.35, 13.20, 14.05** Серыял «Вавілон 5».
**3.45, 5.00, 11.10** Серыял «На краі Сусвету».
**4.25, 5.50, 11.50** Серыял «Зорныя вароты».
**6.30, 7.20, 16.40, 17.25, 22.40, 23.25** Серыял «Твін Пікс».
**8.05, 8.30, 14.55, 15.25** Серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**10.15, 15.45, 21.00, 21.50** Серыял «Ваенная хроніка».
**18.15, 19.35** Серыял «Чорная лагуна».

***У праграме магчымыя змяненні. Передрукоўка праграмы забаронена!***

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 12.00** Цуды інжынерыі.
**6.00** Анаконда, каралева змей.
**7.30** Дзікія жывёлы Поўначы.
**8.00** Мяжа.
**9.00** Дзікая прырода Расіі.
**10.00** Суперзбудаванні.
**11.00** Мегазаводы.
**13.00** У пошуках акул.
**14.00** Рэальнасць або фантастыка?
**15.00** Выпрабуйце свой мозг.
**18.00** Недаследаваныя глыбіні.
**19.00, 1.00, 4.00** Расследаванне авіякатастроф.
**20.00, 23.00, 2.00** Сакрэтная атака Гітлера на Амерыку.
**21.00, 0.00, 3.00** Паляванне на генералаў Гітлера.
**22.00** З пункту гледжання навукі.

### DISCOVERY

**7.00, 7.25** Маланкавыя катастрофы.
**7.55, 3.35** Вынайсці будучыню.
**8.50, 14.20, 23.00, 2.45** Разбуральнікі легенд.
**9.45, 4.25** «Як гэта ўстроена?»
**10.10, 4.50** Як гэта зроблена?
**10.40** Выжыць любой цаной.
**11.35** Палярная гонка.
**12.30** 80 спосабаў абагнуць зямны шар.
**13.25, 22.00** Лабараторыя для мужчын.
**15.15** «Код».
**16.10, 16.35** Каралі аўкцыёнаў.
**17.05** Фрэдзі Флінтоф у дзікай прыродзе.
**18.00, 19.00, 20.00** Вялікая задума па Сціване Хокінгу.
**21.00** «Дынама — неверагодны ілюзіяніст».
**0.00** «Код».
**1.00** Вершнікі пекла.
**1.55** Прасцяк за мяжой.
**5.15** Пяцёрка лепшых.
**6.05** Сітуацыя пад кантролем.

### TRAVEL

**8.00, 0.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**22.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**23.00** Пра галоўнае.
**23.30** Берт заваёўнік.
**1.00** Вакол Ісландыі на натхненні.

### ANIMAL PLANET

**7.00** «Пагаворым з жывёламі».
**7.25** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**8.15** Паляўнічы на кракадзілаў.
**9.10, 5.45** «Заатур Мікаэлы».
**10.05** «Дзік і Дом спяшаюцца на дапамогу».
**10.30** Усё пра сабак.
**11.00** Прыроджаныя паляўнічыя.
**11.25** «Самае дзікае шоу».
**11.55, 21.05, 4.05** У нетрах Лацінскай Амерыкі.
**12.50, 13.45** Дзікая Францыя.
**14.40, 15.05** «Школа ветэрынараў».
**15.35, 16.00** Дзікія сіроткі.
**16.30** Дрэнны сабака.
**17.25** «Пякельная котка».
**18.20** Ветэрынар у дзікай прыродзе.
**19.15** «Небяспечныя маршруты Макса».
**20.10** Перакладчык з сабачай.
**22.00, 2.25** Хуткасць жыцця.
**22.55, 3.15** Цуды Блакітнай планеты.
**23.50** Я жывы.
**0.45, 4.55** Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
**1.35** Як пракарміць кракадзіла.
**6.35** «SOS дзікай прыроды».

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Элемент здароўя.
**5.30, 20.40** Гімнастыка.
**6.00** Зона рызыкі.
**6.30, 21.40** Мужчынскія сакрэты.
**7.00** Практыкаванні для мозга.
**7.30, 22.40** Практыка здароўя.
**8.00, 23.05** Панацэя.
**8.30, 23.35** Нетрадыцыйная медыцына.
**9.00, 0.05** Школа розуму.
**9.40, 0.35** Дзіцячы ўрач.
**10.10, 1.05** Шлях да здароўя.
**10.45, 1.30** Якасць жыцця.
**11.15, 2.00** Я расту.
**11.55, 2.30** Не выходзячы з дому.
**12.35, 3.00** Праўда пра пахудзенне.
**13.05, 19.30, 3.30** Будзь у тонусе!
**13.45, 4.00** Масажы.
**14.15, 4.30** Жаночае здароўе.
**14.55** Генезіс здароўя.
**15.50** Зялёная аптэка.
**16.20** Педыятрыя.
**17.00** Дыягназ невядомы.
**17.55** Тэрапія.
**18.25** Спартыўныя траўмы.
**18.55** Найноўшыя дасягненні.
**21.10** Аздараўленчы турызм.
**22.10** Харчовыя дабаўкі.

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50, 21.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00, 0.30** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.10** Нашы дзеці.
**14.00, 1.20** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 23.40** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Маст. фільм.

---

■ Медыяпрастора

## «СТАЛІЦА» ЗАДАЕ НАСТРОЙ!

Сталіца 105.1

**Выходзіць на ўльтракароткіх хвалях:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **МІНСК** | **72,89 і 105,1 МГц** | **ВІЦЕБСК** | **72,26 МГц** | **Смаргонь** | **66,38** |
| **Мядзел** | **66,86** | **Ушачы** | **70,94** | **Свіслач** | **68,72** |
| **Салігорск** | **68,57** | **Браслаў** | **73,49** | **Любча** | **70,85** |
| **Беразіно** | **67,07** | **Орша** | **73,82** | **Масты** | **70,76** |
| **Капыль** | **73,22** | **ГОМЕЛЬ** | **66,20 МГц** | **МАГІЛЁЎ** | **71,18 МГц** |
| **БРЭСТ** | **72,47 МГц** | **Смятанічы** | **70,28** | **Палыковічы** | **71,18** |
| **Ракітніца** | **72,47** | **Брагін** | **69,11** | **Бабруйск** | **73,01** |
| **Пінск** | **67,88** | **Жлобін** | **71,81** | **Касцюковічы** | **69,38** |
| **Баранавічы** | **71,18** | **Зашчэб'е** | **73,19** | **Асіповічы** | **72,47** |
| **Драгічын** | **69,80** | **ГРОДНА** | **68,90 МГц** | **Мсціслаўль** | **73,73** |
| | | **Геранёны** | **69,26** | | |

**У новым сезоне 2012-2013 гадоў радыёстанцыя «Сталіца» будзе здзіўляць сваіх слухачоў новымі крэатыўнымі ідэямі.**

Кожны будны дзень у 7.00 у эфіры ранішняе шоу «Трое з настроем». Яркае, жывое трыа — вядучыя Ала Рыжэвіч, Ягор Квартальны і гукарэжысёр — створыць для вас не толькі добры настрой з дапамогай якаснай музыкі, парад аўтааматарам, розных пазнавальных конкурсаў, рэцэптаў лёгкага і карыснага снедання, але і пазнаёміць з аператыўнымі навінамі, фінансавай інфармацыяй, культурнай афішай нашай сталіцы і многім іншым.

У штодзённых праграмах «Добры дзень, сталіца» (12.00-17.00), «Добры вечар, сталіца» (19.00-24.00) вядучыя Сяргей Бандарэнка, Алена Ражкова, Арцём Лук'яненка будуць знаёміць слухачоў з навінкамі «Сталічнай» фанатэкі, праводзіць музычныя гульні. У рамках гэтых праграм выходзіць у эфір праграма «Свята кожны дзень», у якой можна павіншаваць са святам сваіх родных, блізкіх, знаёмых і сяброў або проста перадаць ім прывітанне і замовіць іх любімую песню.

На працягу тыдня на хвалях радыёстанцыі «Сталіца» будуць гучаць і іншыя пазнавальныя, забаўляльныя і музычныя праграмы. Больш падрабязна з імі можна азнаёміцца на старонцы ў інтэрнэце www.stalica.tvr.by.

## МУЗЫКА НА МІРНАЙ ХВАЛІ

МИР

| | |
|---|---|
| **Брэст** | **106.6 FM** |
| **Віцебск** | **01.8 FM** |
| **Мінск** | **107.1 FM** |
| **Гродна** | **104.2 FM** |
| **Магілёў** | **107.8 FM** |
| **Бабруйск** | **103.6 FM** |
| **Баранавічы** | **98.4 FM** |
| **Салігорск** | **104.3 FM** |
| **Пінск** | **103.2 FM** |

**Сёння мы працягнем знаёмства з праектамі новага сезона радыёстанцыі «Мір».**

Радуйцеся меламаны! Усе самыя любімыя музычныя праграмы застануцца ў эфіры.

Штодзённа ў 20.45 у рубрыцы Каці Пытлевай «Галопам па Еўропах» вы пачуеце апошнія навіны шоу-бізнэсу. «Хіт-парад «Міра». ТОП-20» — дваццатка лепшых песень эфіру па выніках галасавання на сайце www.radiomir.by, кожную суботу з 15.00. Гід па самых свежых альбомах сусветных «зорак» (праграма «Фанатэка») задаволіць усіх, хто любіць сучасную музыку па нядзелях у 20.45. У гэты ж час вы зможаце пачуць у эфіры і спецыяльныя выпускі праграмы «Лепшыя з лепшых» — гэта сустрэчы з сапраўднымі легендамі, якія ўвайшлі ў залатую калекцыю сусветнага музычнага фонду.

Пра што гаворыць свет кіно, над якімі стужкамі працуюць знакамітыя рэжысёры і каго іграюць не менш знакамітыя акцёры, якія прэм'еры чакаюцца ў кінатэатрах Мінска — пра ўсё гэта можна даведацца з праграмы Ганны Іваніцкай «Кінаметраж» па пятніцах у 14.45.

Палюбіліся слухачам і застануцца ў эфіры новага сезона і праграма «Мадам» — выключна для жанчын па суботах у 18.10 разам з выключна мужчынскай праграмай «Мужчынская праўда» па нядзелях у 18.10.

Начны эфір з 22.00 і да раніцы працягне нон-стоп лепшай сусветнай музыкі. ■

---

# «ПАСТАЯННА АДЧУВАЮ СЯБЕ ЦЯЖАРНАЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Мяне вельмі пужаюць** выпадковыя дзеці. Яго ніхто не чакаў, а ён адбыўся. Яму ніхто не рады, ад яго ўсе адбіваюцца. Людзям трэба рыхтавацца да свядомага бацькоўства. Часта бачу маму з навушнікамі, якой дзіця спрабуе нешта расказаць. Расказаў раз, два — не адчула водгуку. І дзіця — не дурное, яна перастала гуляць у гэтыя вароты. Праз 10 гадоў тая мама бяжыць да ўчастковага, псіхолага. Як жа так, у яго ёсць усё, але ён мяне зусім не слухае. Дарагая, калі ён хацеў з табой пагаварыць, ты хадзіла з заткнутымі вушамі... У сям'і адбыўся раскол. І гэтыя расколатыя сем'і — проста бяда на сёння.

**Звярніце ўвагу:** у дзяцей, якіх у сям'і не любяць, цьмяныя і ломкія валасы. Яны, як іголкі ў вожыкаў, тырчаць у розныя бакі, таму што не адчуваюць той энергіі любові, якая ім вельмі патрэбна. Іх рэдка гладзілі па галаве, вось валасы і сталі жорсткімі, а не бліскучымі і гладкімі.

**Вымушана прызнаць,** што наша грамадства пакуль яшчэ з насцярожанасцю ставіцца да ўсынаўлення. Мы не любім тых, хто адрозніваецца ад нас. Я гэта прыкмячаю, нягледзячы на тое, што я звычайная жанчына, у мяне звычайнае бацькоўства — такое, як у пераважнай большасці нашых жанчын. Але я працую з незвычайным бацькоўствам. Я ведаю, як людзі пакутуюць ад таго, што грамадства падазрона да іх ставіцца.



## ПРА СЛЯДЫ, ТАЙНУ І ПАРТЫЗАНСКІЯ ЎСЫНАЎЛЕННІ

**Хоць я атэістка,** тым не менш мне вельмі падабаецца адно біблейскае выказванне: і апошнія стануць першымі. Няхай сёння гэта сям'я з вялізнымі праблемамі, тата і нават мама ўлягаюць у спіртныя напоі. Прычым так улягаюць, што іншы раз забываюць забраць дзіця з дзіцячага садка. Але трэба даць ім, цяпер апошнім, шанц стаць у нечым першымі. Такія прыклады, калі людзі выпраўляюцца, ужо ёсць. І гэта ўсяляе вялікі аптымізм. Недапушчальная канфрантацыя паміж роднай сям'ёй, і ўсынавіцелямі, непаважлівае стаўленне да роднай сям'і, калі яно дэманструецца ўсынавіцелямі, — гэта непавага да дзіцяці.

**Многія думаюць:** «Мы ўзялі кветку з не вельмі добрага гаршка, перасадзілі — і ўсё будзе клас». Гэта не так. Дзіця ніколі не забудзе сваю родную сям'ю. У яго застануцца няхай не ўспаміны, а нейкія адчуванні аб нечым цёплым і вялікім ці аб халодным і маленькім. І задача ўсынавіцеляў не спрабаваць зацерці сляды, а спакойна і з павагай прыняць гісторыю жыцця дзіцяці, не спрабуючы пры гэтым даказаць сабе, дзіцяці і навакольным, што «мы добрыя, моцна цябе любім, а яна (твая мама, родная сям'я) — дрэнная, яна цябе кінула». Калі ставіцца да родных людзей дзіцяці з пагардай, калі лічыць яго ранейшы вопыт непрыглядным, значыць, выгадаваць здаровую асобу не атрымаецца. Нават калі цяперашні выхавальнік дзіцяці — чалавек высокіх маральных якасцяў.

**Я катэгарычна супраць** тайны ўсынаўлення, я — за адкрытае ўсынаўленне. Бо ведаю, як гэта тайна баліць усё жыццё ў кожнай сям'і, якая выбрала гэты зусім тупіковы шлях. Прачытала вопыт адной амерыканкі — аўтаркі вядомых работ па ўсынаўленні. Жанчыну ўсынавілі, калі ёй было 4 месяцы. Яна трапіла ў вельмі добрую сям'ю і адбылася. Цяпер у яе двое сваіх дзяцей, цудоўны муж, цікавая праца, вучоная ступень. Яна піша, што самы вялікі боль адчувала ў сваім жыцці ад тайны ўсынаўлення, «бо мне ніхто не расказаў, чаму гэта здарылася менавіта са мной».

**Дзіця павінна** ведаць праўду! Каб не было пасля шоку, калі тайнае стане яўным. Дзіцяці ж, па вялікім рахунку, усё роўна: нарадзілася яно «як усе» ці яго ўсынавілі, знайшлі ў капусце, прынёс бусел... Галоўнае, каб яго — любілі! Кожны мае права ведаць свае карані: жыць у гэтым веданні лягчэй, лягчэй прымаць рашэнні.

**Думаю,** што нейкае бязладдзе ў сферы ўсынаўлення магчымае ў тых краінах, якія не ратыфікавалі Гаагскую канвенцыю (Беларусь гэта зрабіла ў 2003 годзе. — **Н. Д.**). Усе расійскія дзеці, з якіх здзекаваліся ў амерыканскіх прыёмных сем'ях, аказаліся па-за Расіяй у выніку незалежнага, або, як я яго называю, партызанскага ўсынаўлення. Гэта значыць, замежнікі захацелі ўсынавіць — прыехалі, плацілі ці не плацілі — гэта асобнае пытанне (кожны распавядае, што плаціў), купілі, павезлі, пакалечылі і забілі. Хто ацаніў магчымасці гэтых сем'яў быць усынавіцелямі? Хто нясе адказнасць за тое, як яны выхоўваюць усыноўленае дзіця? Хто гарантаваў, што дзяржаўныя сацыяльныя службы будуць цікавіцца становішчам дзіцяці ў новай сям'і? Ніхто! Ніводны дзяржаўны орган краіны, якая прымае дзіця! Гэта проста нонсэнс! Дык вось, калі б усынаўленне адбывалася па артыкулах Гаагскай канвенцыі, — выключна праз пагадненні паміж кампетэнтнымі органамі дзяржаў — здзекаў з дзяцей і тым больш забойстваў не было б.



## ПРА АДЗІНОКІХ МУЖЧЫН, МЫШЦЫ І СКЛАДАНЫЯ РЭЧЫ

**У групе,** дзе мы ажыццяўляем псіхолага-педагагічную падрыхтоўку да ўсынаўлення, займаецца адначасова 15-18 чалавек. І мы радуемся, калі нехта з групы ўстаў і сказаў: «Я зразумела, гэта не мой шлях, я села не ў свае сані». Мы вельмі рады, што такая думка ўзнікла да таго, як дзіця трапіла ў сям'ю.

**Часам дзіця разглядаецца** ўсынавіцелямі не як мэта, а як сродак для захавання сям'і. Вось усынавім — і будзе нам шчасце... Гэта ўсё не больш чым ілюзіі. Нам удаецца даказаць людзям, што не дадзена дзіцяці ўтрымаць сям'ю ад распаду... Прынамсі, я ніводнай такой сям'і не бачыла — ні біялагічнай, ні ўсынавіцельнай.

**Звяртаюцца часам і адзінокія** мужчыны. Хачу сказаць, што яны паспяхова спраўляюцца з выхаваннем. Выхоўваюць па некалькі дзяцей, на адным, як правіла, не спыняюцца, у адрозненне ад адзінокіх жанчын, якія раствараюцца ў адным дзіцяці. Я ж па натуры педагог той яшчэ закваскі, маё прафесійнае станаўленне прыпала на савецкія гады. Таму я моцнаму полу не давяраю і не разглядаю мужчыну як паўнавартаснага выхавальніка. У мужчыны, на мой погляд, іншыя задачы ў жыцці. Але тыя выпадкі сем'яў «мужчына — усыноўленае дзіця», якія мы змадэлявалі, выбіваюць з-пад мяне ўсю гэтую цвёрдакаменную глебу.

**Дзеці з часам становяцца** падобнымі да сваіх прыёмных бацькоў. Французскі філосаф Ламбразо даказаў, што падобнасць у рысах твару ўзнікае з-за таго, што дзеці навучаюцца напружваць мышцы пад тым жа вуглом, што мама. Тое ж самае з мужам і жонкай. Калі вы бачыце, што людзі аднолькава напружваюць мышцы, паказваючы эмоцыі, гэта сведчыць пра тое, што яны перанялі сістэму каштоўнасцяў адно аднаго, а значыць — прынялі, палюбілі адно аднаго.

**Глыбока перакананая**, што ў выхаванні дзіцяці павінны ўдзельнічаць усе сем'і, якія яму па-сапраўднаму дарагія: сям'я, якая нарадзіла, прыёмная і сям'я ўсынавіцеляў. Чым больш людзей любяць дзіця, тым яму лепш. Гэта вельмі складаныя рэчы. Наўрад ці той, хто будзе чытаць, пагодзіцца і раздзеліць гэтыя думкі з першага разу. Я да гэтага ішла 23 гады.

## ПРА ЭМОЦЫІ, АПОШНІЯ СОКІ І «СМАЖАНЫЯ» АРТЫКУЛЫ

**Я чалавек вельмі эмацыйны.** Некаторыя кажуць, што для кіраўніка гэта дрэнна. Але без эмоцый і пачуцця гумару ў нашай працы нельга. Быць неэмацыйным чалавекам і працаваць з асаблівымі лёсамі людзей немагчыма. Я не саромеюся праяўляць свае эмоцыі, таму людзі з лёгкасцю разумеюць, якую думку я хачу данесці да іх.

**Пастаянна працую** над тым, каб усё ж такі аддзяліць працу ад асабістага. У іншым выпадку гэта прывядзе да выгарання. Стараюся пераключацца з праблем кліентаў. Добра, што ў мяне цудоўныя калегі, якія дазваляюць гэта рабіць з лёгкасцю.

**Адпачываю** так, як і ўсе. Проста пераключаюся. Апошнім часам, гэта музыка і кнігі. На першым месцы, безумоўна, сын і яго праблемы. Увосень заўсёды дача, грыбы, яблыкі і выцісканне з іх апошніх сокаў. Таму абсалютна звычайнае ў мяне жыццё. Часам людзі не вераць, гавораць : «Ага, у цэнтры ўсынаўлення сядзіць і расказвае, што яна на агародзе працуе». Але ж вы бачылі, якія ў мяне рукі (*смяецца*). Часам людзі думаюць пра нас не тое, што мы ёсць насамрэч. Мяне гэта не засмучае. Я да гэтага стаўлюся спакойна.

**Мяне не вельмі любяць** СМІ. Таму што я кажу тое, што думаю пра іх. Мяне абураюць непрадуманыя рэпартажы. Разгортваеш газету, а там побач з фотаздымкам хлопчыка аповед пра тое, як мама карміла яго разам з сабакамі. Ледзь не біяграфічныя звесткі дзіцяці прыводзяцца. Зразумела, гэта выбівае слязу ў паловы Чыжоўкі і Лошыцы. Як правіла, на такія «смажаныя» артыкулы ў мамы, хоць яна не пазбаўлена бацькоўскіх правоў, ці іншага законнага прадстаўніка дзіцяці ніхто дазволу не пытае.



Гэта яўнае прыніжэнне і грэбаванне гэтымі людзьмі, у першую чаргу — дзіцем! Цяпер, са з'яўленнем інтэрнэту, газеты маюць неабмежаваны тэрмін жыцця. А праз 10 гадоў гэтаму Пецьку, напрыклад, у разведцы служыць. Яму не трэба гэта белетрыстыка. Я лічу, што гэта нанясенне агрэсіўнага ўдару па будучыні дзіцяці, гэта неакуратнае ўмяшальніцтва ў гісторыю яго жыцця. Не рабіце дзяцей сродкам для масавай інфармацыі. Дзіця — заўсёды мэта, яно сродкам, а тым больш масавай інфармацыі, быць не можа па азначэнні.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

■ Чытач — газета

# ПРЫЗЫ — ПАДПІСЧЫКАМ!



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*Расказаў бы — слоў не маю,*
*Як «Звязду» маю люблю:*
*Да радочка днём чытаю*
*І да ранку з ёю сплю!*

**ГЭТЫЯ вершаваныя радкі разам з карткай на розыгрыш прызоў даслала спадарыня Магілёўчыц з Мінска. Яна ж прызналася, што сама рыфмаваць не мастак — верш прачытала калісь у «Звяздзе», якую выпісвае больш за 20 гадоў і якую чытае менавіта вось так, «да радочка».**

Яе картка, як і іншыя, дасланыя ў рэдакцыю, магла аказацца шчаслівай, але...

Днямі адбыўся розыгрыш прызоў па выніках падпіскі на чацвёрты квартал 2012 года.

Прозвішчы тых, каму пашчасціла — у бліжэйшым нумары газеты. Пакуль жа...

Па традыцыі, лёс звяздоўскіх прызоў вяршыла адмысловая тыражная камісія ў складзе — у тым ліку — інжынера ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Таццяны Васільеўны Слабко і загадчыка вытворчага аддзела газеты Аляксандра Анатольевіча Сянько *(на здымку)*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Радзівонаў. Абух. Абабак. Кіт. Ялта. Анклаў. Рэч. Брэсан. Кліка. Канва. Рагу. Лусака. Ворыва. Барана. Мяч. Душ. Банан. Вораг. Гол. Карэц. Сабака. Промах. Ложа. Авар. Ганчарэнка.

**Па вертыкалі:** Капскі. Глеб. Атос. Тарас. Асадак. Ясак. Нуга. Піза. «Даная». Апаш. Бланк. Эколаг. Арарат. Мова. Баран. Кажан. Згуба. Харч. Качка. Бас. Бора. Клір. Калымага. Ачаг. Вянок. Кроў. Урач. Лактоза.


Закрытое акционерное общество

**ЗАО «ОНЕРБАНК»**

220004, г. Минск, ул. К. Цеткин, 51, пом. 1
Тел./факс 306 06 90. **Наш сайт: www.hbank.by**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2012 г.**

Наименование банка ЗАО «Онербанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2012 | 01.10.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 115,2 | 1 232,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 33 324,4 | 23 140,0 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 30 368,4 | 55 356,8 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 27 395,5 | 3 410,8 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 54 273,6 | 19 193,9 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 423,5 | 5 683,5 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 2 214,6 | 1 284,3 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 160 115,2 | 109 302,0 |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 13 907,4 | 13 086,3 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 66 475,9 | 44 504,8 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 5 562,2 | 3 571,8 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 1 462,0 | 1 111,0 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 87 407,5 | 62 273,9 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 46 710,0 | 46 710,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 2 335,5 | - |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 6 367,3 | 50,0 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 17 294,9 | 268,1 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 72 707,7 | 47 028,1 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 160 115,2 | 109 302,0 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2012 г.**

Наименование банка ЗАО «Онербанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2012 | 01.10.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 9 260,6 | 5 071,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 307,3 | 797,6 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 953,3 | 4 274,3 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 630,8 | 490,0 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 374,5 | 36,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 256,3 | 453,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 20,5 | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 288,1 | 26 838,8 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 744,0 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (18 418,1) | 24 546,7 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3,8 | 81,3 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7 737,5 | 3 347,4 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 460,2 | 251,6 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 19 742,4 | 4 246,1 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 1 244,4 | 701,0 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 18 498,0 | 3 545,1 |

**Председатель Правления** **М.Р. Зарифиан Раджаи**

**Главный бухгалтер** **Л.И. Кислюк**

**Дата подписания «10» октября 2012 г.**

*Лицензия на осуществление банковских операций, выданная НБ РБ № 32 от 16.10.2009 г.*


## А ДЗЕ СЕРТЫФІКАТ?

У ходзе правядзення мерапрыемстваў па абароне спажывецкага рынку работнікамі Наваполацкага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Віцебскай вобласці і супрацоўнікамі Віцебскай мытні затрыманы аўтамабіль «MAN», які перавозіў у Расію пшанічную муку вышэйшага гатунку беларускай вытворчасці. У аўтамабілі знаходзіліся 400 мяхоў мукі агульнай вагой 20 тон. Пры праверцы суправаджальных дакументаў высветлілася, што ў перавозчыка адсутнічае неабходны для перамяшчэння грузу фітасанітарны сертыфікат. Груз коштам 50 мільёнаў рублёў затрыманы.

## ВАКЗАЛЬНЫ ХУЛІГАН

У Оршы на чыгуначным вакзале 37-гадовы непрацуючы жыхар Талачына беспадстаўна пабіў мужчыну і жанчыну. Спачатку ўдарыў кулаком у твар 25-гадовага электраманцёра Аршанскай дыстанцыі электразабеспячэння. А потым дасталася 40-гадовай прыбіральшчыцы ААТ «Чырвоны барацьбіт». Медыкі канстатавалі, што ахвяры хулігана атрымалі лёгкія цялесныя пашкоджанні, якія не пацягнулі за сабой расстройства здароўя. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Спорт

# ІСПАНСКІЯ БАЛЕЛЬШЧЫКІ ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ФУТБОЛА

Перадматчавая прэс-канферэнцыя Вісэнтэ дэль Боске *(на фота)*, галоўнага трэнера зборнай Іспаніі, сабрала аншлаг. Фатографы шчоўкалі затворамі, рэпарцёры працягвалі дыктафоны, а аператары скрупулёзна запісвалі выступ сівога пірэнейскага патрыярха. Вось ён, перад намі, той, хто двойчы прыводзіў «Рэал» да залатых медалёў у нацыянальным першынстве, а іспанскую каманду — да галоўных узнагарод чэмпіянату свету.



Фота Надзеі БУЖАН.

Да «коўча» «чырвонай фурыі» было блізка, але ніякай зорнасці не адчувалася. Наогул, дэль Боске рабіў уражанне простага чалавека, які этычна, сур'ёзна, без эмоцый адказваў на кожнае пытанне. Відаць, што за жыццё ён пабачыў многае, а таму здзівіць яго складана. Аднак, як адзначыў сам спадар Вісэнтэ, ад зборнай Грузіі, якую перамаглі 1:0, іспанцы чакалі аднаго, але ўбачылі іншае. Спадзяёмся, і Беларусь іспанцаў здзівіць. Прыклад БАТЭ ў гульні з «Баварыяй» пацвярджае тое, што кожны можа дасягнуць таго, чаго вельмі хоча. Толькі вось як гэта зрабіць, калі супрацьстаяць табе будзе амаль зборная свету? Зразумела, дэль Боске прызнаўся, што яго каманда будзе змагацца за перамогу, гуляць першым нумарам, а яшчэ дадаў, што невысокай тэмпературы ўдзень сустрэчы ніхто не баіцца. «У зборнай Беларусі добры склад футбалістаў. Мы бачылі матчы нацыянальнай зборнай і, безумоўна, праглядалі сустрэчу БАТЭ з «Баварыяй». Ведаем беларускіх футбалістаў і ў індывідуальным, і ў калектыўным плане». А вось Альвара Арбелоа, які трымаў слова перад журналістамі разам з Фернанда Торэсам, прызнаўся, што ў беларусаў патэнцыял большы, чым у грузінаў, і выказаў упэўненасць у добрай падрыхтоўцы саперніка.

Цікава, але самую нечаканую навіну мы пачулі не ад футбалістаў і трэнера, а ад іспанскага журналіста, да якога звярнуліся таксама па каментар. Аказваецца, мінскі матч у Іспаніі трансляваць не будуць! А мы думалі, што толькі ў нас збоі з трансляцыямі бываюць.

— Нямецкая кампанія SportFive набыла правы на трансляцыю матча ў беларускай федэрацыі, — кажа Хаакін Марота, журналіст, аўтар кнігі «Метад дэль Боске». — А зараз збіраецца прадаць іспанскім тэлеканалам прыкладна за 3 мільёны еўра. Цяпер цана ўжо 1 мільён, але федэрацыя вырашыла не набываць правы, каб наступным разам не паўтараліся падобныя сітуацыі і не прасілі завоблачных коштаў.

Марота кажа, гэта першы выпадак з 50-х, калі ў Іспаніі не будуць трансляваць матч. Тады была крыху іншая гісторыя. У 1983-м тэлевізійнікі не паказалі гульню з Мальтай з-за тэхнічных хібаў. Але іспанскае тэлебачанне запісала сустрэчу і прадэманстравала ўжо потым.

**— А ці стала гэта трагедыяй для тамтэйшых балельшчыкаў?**

— Для іспанцаў больш значная праблема — гэта крызіс: знайсці працу, утрымліваць сям'ю. А падобнае пытанне ўжо адыходзіць на другі план.

Добра, што хоць у нашых праграмах усё без змен. Трансляваць гульню будзе канал «Беларусь-2». Пачатак — 20:50.

**Тарас ШЧЫРЫ**






## СЁННЯ

**Сонца** Усход Захад Даўжыня дня

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.32 | 18.19 | 10.47 |
| Віцебск — | 7.24 | 18.08 | 10.44 |
| Магілёў — | 7.22 | 18.09 | 10.47 |
| Гомель — | 7.17 | 18.08 | 10.51 |
| Гродна — | 7.47 | 18.34 | 10.47 |
| Брэст — | 7.46 | 18.37 | 10.51 |

### Месяц

***Маладзік 15 кастрычніка. Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.*** *Івана.*
***К.*** *Вітольда, Максіміляна, Серафіма, Яўстаха.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сыходзячы з класа, хлопчык Федзя так моцналяснуў дзвярыма, што клас пакінуў і хлопчык Пеця, які сядзеў на падаконніку.**

— Я ўжо практычна жыву на сваёй працы! Але заработная плата становіцца пры гэтым толькі меншай...

— Мабыць, сталі вылічваць за пражыванне.

**Вяртаецца Мікола з заапарка, куды хадзіў глядзець на яка. Кум яго пытаецца:**

**— Ну як як?**

**— Ну як як? Як як як...**



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.149. Індэкс 63850. Зак. № 4633.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2012 года.